## НАША КРАІНА НАБЫВАЕ СТАТУС НАЗІРАЛЬНІКА Ў ШАНХАЙСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з рабочым візітам ва Уфу для ўдзелу ў мерапрыемствах, звязаных з правядзеннем сустрэч на вышэйшым узроўні міждзяржаўнага аб'яднання БРІКС і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.**

Акрамя ўдзелу ў сустрэчы кіраўнікоў краін, якія ўваходзяць у БРІКС, з лідарамі запрошаных дзяржаў для абмеркавання найбольш актуальных пытанняў сусветнай палітыкі, эканомікі, фінансавай сферы, у рабочым графіку Прэзідэнта значыцца і шэраг двухбаковых сустрэч.

У прыватнасці, учора Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным, паведамляе БЕЛТА. Прэзідэнт Расіі падчас сустрэчы паведаміў, што Беларусь набывае статус назіральніка ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. «Гэтае пытанне можна лічыць вырашаным», — сказаў кіраўнік расійскай дзяржавы. «Мы ўпэўнены ў тым, што ваш удзел у рабоце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва пойдзе на карысць як Беларусі, так і ўсім удзельнікам арганізацыі», — адзначыў расійскі лідар.

У сваю чаргу, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь абсалютна падтрымлівае дзеянні БРІКС і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва на сусветнай арэне. Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што «нарэшце знайшліся арганізацыі, якія рызыкнулі вызначыць некалькі іншыя кірункі дзеянняў на сусветнай арэне». «Гэта намі абсалютна падтрымліваецца, прымаецца. Гэта будзе толькі на карысць усім людзям, якія жывуць на зямлі. І тыя імпульсы ў фінансавым, эканамічным дачыненні, якія вамі зроблены ў апошні час у рамках Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, БРІКС, — гэта вельмі добрыя кірункі», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Уладзіміру Пуціну за падтрымку беларускага боку.

## ЛІДАРЫ ЕЎРАПЕЙСКІХ ДЗЯРЖАЎ АДЗНАЧАЮЦЬ РОЛЮ БЕЛАРУСІ Ў АРГАНІЗАЦЫІ ПЕРАМОЎ ПА УКРАІНЕ

**Аб гэтым сведчаць віншавальныя пасланні з нагоды Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, якія працягваюць паступаць у адрас Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У прыватнасці, Прэзідэнт Германіі Іахім Гаўк у сувязі з гэтым падкрэсліў, што гатоўнасць Беларусі падтрымліваць сумесныя еўрапейскія намаганні па захаванні бяспекі і міру на кантыненце заслугоўвае прызнання.

Віншавальныя пасланні ў адрас беларускага лідара працягваюць паступаць ад кіраўнікоў замежных дзяржаў, замежных палітычных, грамадскіх дзеячаў. З нацыянальным святам Аляксандра Лукашэнку і беларускі народ у тым ліку павіншавалі прэзідэнты Алжыра, Грэцыі, Італіі, Лаоса, Кот-д'Івуара, Румыніі, Сірыі, Турцыі, Францыі, Эквадора, каралі Іарданіі, Марока, Саудаўскай Аравіі, Тайланда, а таксама султан Амана, эмір Катара.

■ Стыхія

## ПАЖАР ПРАРЫВАЕЦЦА ПРАЗ МЯЖУ

### Каля 200 чалавек змагаюцца з агнём

— Моцны вецер гоніць полымя з Украіны на Гомельшчыну, — паведаміў **намеснік старшыні Лельчыцкага райвыканкама Дзмітрый ШПІГАНОВІЧ**, які на момант сувязі знаходзіўся ў сітуацыйным штабе ліквідацыі надзвычайнага здарэння.

Ля вёсак Кавыжаў і Лохніца, што зусім побач з дзяржаўнай мяжой, увесь дзень 8 ліпеня ішло актыўнае тушэнне пажару. Дарэчы, полымя перакідваецца як па верхавінах дрэў, так і сцелецца па зямлі. Адна з крыніц узгарання знаходзіцца ў багністай мясцовасці. Менавіта таму для тушэння задзейнічана ўся магчымая тэхніка. На зямлі — сельскагаспадарчая, лесагаспадарчая і спецыялізаваная. З неба пажар тушаць верталёты Мі-26 і Мі-8. Каля 200 чалавек выйшлі на барацьбу з агнём. Пакуль ніхто не дае прагнозаў наконт таго, калі пажар будзе затушаны, бо вецер не сціхае, а яго напрамак пастаянна мяняецца. Выратавальнікі лічаць, што максімальная плошча, ахопленая полымем, складае каля 120 га. Тым не менш, панікі сярод людзей няма, усе службы працуюць зладжана.

У раёне памежнага пераходу «Глушкавічы» агонь, які ішоў з тэрыторыі Украіны, быў спынены непасрэдна на мяжы з Беларуссю з дапамогай аборвання. Арганізавана пастаяннае дзяжурства. Леснікі, вайскоўцы Мазырскай памежнай групы, выратавальнікі-пажарныя адсочваюць сітуацыю.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *astashkevich@zviazda.by*

■

БПС-СБЕРБАНК

С 09.07.2015 ОАО «БПС-Сбербанк» снижает размер процентов по заключенным с 22.01.2015 по 26.03.2015 (включительно) договорам в долларах США и евро срочного банковского депозита «Доверяй +» на 0,5 п.п. – до 6% (годовых).

Установленный размер процентов будет применен с 09.08.2015.

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по единому короткому номеру 148.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

■ Жыллё маё

# ЗАПЛАНАВАЛІ ТОЛЬКІ РЭАЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ

### Днямі ўрад краіны скарэкціраваў праграму жыллёвага будаўніцтва на 2015 год

**Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 30 чэрвеня №538. Згодна з дакументам, збіраюцца ўвесці ў эксплуатацыю 4 млн кв. м жылля. У тым ліку для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, сёлета плануецца пабудаваць 3 млн 485,9 тысячы кв. м, з якіх 2 млн 864,6 тысячы кв. м — для тых, хто ажыццяўляе будаўніцтва з дзяржпадтрымкай. Атрымліваецца, што ўдакладненая праграма па краіне губляе адразу мільён «квадратаў» запланаванага жылля.**

#### ШМАДЗЕТНЫМ ДАБАВІЛІ

Саўмін пераглядзеў гадавы аб'ём будаўніцтва жылых дамоў (кватэр) для шматдзетных сем'яў, які зараз павялічыўся і склаў 364,1 тысячы кв. м. Раней для гэтай катэгорыі ў краіне хацелі пабудаваць жыллё для 4130 шматдзетных сем'яў, цяпер — для 4400. Крыху павялічылі планы па ўзвядзенні жылля сацыяльнага карыстання і жылля, пабудаванага для адсялення грамадзян з аварыйных дамоў.

#### КАМЕРЦЫЙНАЕ — ПАДРЭЗАЛІ

Арэнднага жылля мяркуецца пабудаваць у краіне 185,7 тысячы кв. м, што значна менш за папярэднія планы, па якіх толькі ў Мінску разлічвалі ўзвесці каля 147,6 тысячы кв. м. Найбольш аб'ём у памеры 43,4 тысячы кв. м. камерцыйнага жылля будзе пабудаваны ў Гродзенскай вобласці з улікам жылых дамоў для работнікаў, якія выконваюць комплекс работ па будаўніцтве ў Астраўцы атамнай электрастанцыі. А вось у Мінску плануецца ўзвесці толькі 33,6 тысячы кв.м. жылля для камерцыйнага выкарыстання.

#### СПАДАРОЖНІКІ ПАЧАКАЮЦЬ

Знізілі аб'ём будаўніцтва жылых дамоў (кватэр) і ў гарадах-спадарожніках, які запланаваны на ўзроўні 7,5 тысячы кв. м жылля. Асобныя праекты па гэтым напрамку ўвогуле замарозілі. У прыватнасці, у Смалявічах сёлета будаваць нічога не будуць, а да гэтага планавалі здаць кватэры для 230 сем'яў.

#### ПЛАНЫ КАРЭКТУЮЦЦА ФІНАНСАВАННЕМ

Распрацоўшчыкі пастановы Саўміна падрыхтавалі папярэдні прагноз і на 2016 год. Налета ў Беларусі плануецца ўвесці ў эксплуатацыю таксама 4 млн кв. м жылля, у тым ліку каля 1 млн 580 тысяч для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў і якія ажыццяўляюць будаўніцтва з дзяржаўнай падтрымкай.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Нагадаю, што яшчэ вясной **міністр Мінбудархітэктуры Аляксандр КРУЧАНАЎ** ацэньваў заданне на 5 млн жыллёвых «квадратаў» па краіне як нерэальнае. На яго погляд, у галіны цяпер недастаткова сродкаў на ажыццяўленне такога аб'ёму будаўніцтва, у тым ліку на фінансаванне будаўніцтва 2,5 млн кв. м жылля з дзяржпадтрымкай.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

■ Сітуацыя

## МІНГАНДЛЮ БОЛЬШ НЕ ПАПЯРЭДЖВАЕ

### Рэстаран «Журавінка» закрылі за пратэрміноўку, а сетку магазінаў «Дабраном» — за даўгі

**У міністэрстве паведамляюць, што падчас пазапланавай праверкі парушэнні патрабаванняў заканадаўства аб гандлі і абароне правоў спажыўцоў выяўлены ў рэстаране «Журавінка», рэстаране хуткага абслугоўвання «Food Republic» і кафэ «River Cafe» (таварыства «Шахін») сталіцы.**

#### НЕДАВАЖКА — ДА 40%

Усяго кантралёрамі знята з рэалізацыі пратэрмінаваная прадукцыя на суму каля 14 млн рублёў. Устаноўлены факты невыканання асартыментных пералікаў, тэмпературных рэжымаў захоўвання прадукцыі, парушэнні кантролю якасці і бяспекі выпускаемай прадукцыі, захоўвання прадукцыі без дакументаў, якія пацвярджаюць факт яе набыцця, якасць і бяспеку. Былі парушэнні пры рэалізацыі алкагольных напояў без акцызных марак і з пашкоджанымі акцызнымі маркамі і г.д.

Прэс-служба ведамства паведамляе, што таксама выяўлены выпадкі падману пакупнікоў: пры выбарачным узважванні асобных гатовых страў недаважка ў іх склала да 40% ад намінальнай масы, якая вызначана ў тэхналагічных дакументах. Для ліквідацыі выяўленых парушэнняў і забеспячэння сапраўднага кантролю за якасцю і бяспекай прадукцыі, што там рэалізуецца, дзейнасць гэтых аб'ектаў прыпынена з 8 ліпеня.

#### 177 МАГАЗІНАЎ — У «АДПАЧЫНАК» НА 90 ДЗЁН

Крыху пазней Міністэрства гандлю прыняло рашэнне і аб прыпыненні на 90 дзён (з 21 ліпеня) дзейнасць 177 магазінаў закрытага акцыянернага таварыства «Дабраном».

Пачынаючы з лютага бягучага года, пытанне своечасовасці разлікаў гандлёвых сетак з пастаўшчыкамі за пастаўленую прадукцыю неаднаразова абмяркоўвалася на пасяджэннях калегіі Мінгандлю. Сеткавым арганізацыям прапаноўвалася прыняць выча́рпальныя меры па пагашэнні пратэрмінаванай запазычанасці», — гаворыцца ў паведамленні ведамства. Разам з тым, на момант праверкі фірмы «Дабраном» пратэрмінаваная запазычанасць арганізацыі за пастаўленыя тавары, у тым ліку мяса, малако і хлеб, склала звыш 30 млрд рублёў. Зараз у гаспадарop гандлёвай сеткі ёсць 90 дзён, каб разлічыцца па даўгах.

**Сяргей ПАЛІНІН**

■

■ Грошы

## ПРАДАЛІ $3,5 млрд ЗА ПАЎГОДА

**Беларусы працягваюць заставацца чыстымі прадаўцамі валюты, хоць і павялічылі ў апошні месяц куплю замежных наяўных грошай.**

Па звестках Нацбанка, у чэрвені грамадзяне купілі на 29,3% больш валюты ў параўнанні з маем — 508,3 млн долараў. Сёлета столькі яшчэ не куплялі. Пры гэтым продаж вырас на 2,4% — 615,2 млн долараў. З улікам безнаяўнага продажу валюты насельніцтва таксама застаецца чыстым прадаўцом. Агулам жа ў студзені—чэрвені грамадзяне прадалі 3,657 млрд долараў, купілі — 2,968 млрд.

Сальда куплі-продажу валюты беларускімі суб'ектамі гаспадарання за шэсць месяцаў таксама адмоўнае. Рэзідэнты купілі 9,016 млрд долараў, прадалі — 9,078 млрд.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.** *kuletski@zviazda.by*

■

■ Не для пераймання

## ВАЛЮТЧЫК ПА ВЫКЛІКУ

### Прыватны абменнік у Полацку «пацягнуў» на крымінальную справу

**Новая дзейнасць беспрацоўнага грамадзяніна М. у горадзе Полацку пачалася яшчэ ў снежні 2013-га, калі ён арганізаваў для іншых фізічных асоб незаконныя аперацыі па абмене замежнай валюты на беларускія рублі і наадварот. Паводле інфармацыі намесніка начальніка Наваполацкага міжраённага аддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці Дзмітрыя ДЗЯГІЛЕВА, спрытны прадпрымальнік кожную раніцу прыходзіў у кавярню, размешчаную ў раёне гарадскога калгаснага рынку, як на працу.**

Там ён піў каву і чакаў кліентаў, якія заходзілі асабіста для абмену валюты альбо тэлефанавалі яму і дамаўляліся пра сустрэчу побач з кавярняй. Калі неабходна было абмяняць буйную суму грашовых сродкаў, валютчык гатовы быў выехаць на тэрыторыю кліента. Звычайна валюту ў яго набывалі прадпрымальнікі з калгаснага рынку, а прадавалі яе як звычайныя грамадзяне, так і прадпрымальнікі, якія прывозілі выручку ў замежнай валюце пераважна з Расіі. У выніку куплі-продажу грашовых знакаў полацкі валютчык атрымаў даход на суму звыш 224,3 млн рублёў, што на момант здзяйснення злачынства перавысіла 1,2 тысячы базавых велічынь. А гэта ўжо з'яўляецца буйным памерам.

Пры гэтым мясцовы жыхар ажыццяўляў прадпрымальніцкую дзейнасць без дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы, якая ажыццяўляе банкаўскую дзейнасць, і спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на валютна-абменныя аперацыі.

Менавіта таму Наваполацкім міжрайаддзелам фінансавых расследаванняў і была заведзена крымінальная справа па лініі «фінансава-крэдытная сістэма» ў дачыненні да 46-гадовага «шэрага» прадпрымальніка. Варта адзначыць, што ўся сума незаконнага даходу была ў поўным аб'ёме выплачана парушальнікам у бюджэт.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■